Прызнаная элітарнасць эсэ — вынік рэдкага дару эсэіста. Гэта жанр дасціпных, эрудзіраваных, бліскучых літаратараў, якія дзеляцца сваім інтэлектуальным багаццем, назіральнасцю, учэпістай памяццю, вялікім жыццёвым вопытам. Прынята гаварыць нават пра «кабінетнасць» таленту эсэіста. Успомнім, што «Разважанні» Марка Аўрэлія — аднаго з першых у гісторыі эсэістаў — не што іншае, як «кабінетная» апрацоўка вядомых філасофскіх тэорый.

Свабодны, не абмежаваны строгімі рэгламентацыямі і стыль эсэ. Самыя разнастайныя пласты лексікі — ад зніжана-размоўнай да паэтычнай — спалучаюцца ў эсэ з гібкімі сінтаксічнымі канструкцыямі. Асноўныя характарыстыкі эсэісцкага стылю — экспрэсіўнасць і вобразнасць, значнае праяўленне настрою, думак і пачуццяў. Свабодную эсэісцкую манеру пісьма нельга аддзяліць ад адточанасці, «элегантнасці», дасканаласці стылю. Гэта, нараўне з незалежнасцю думкі, агульнапрынятая аснова эсэ. Калі падабраны слушныя словы і ўстаноўлена дакладная інтанацыя, стыль становіцца другім «Я» пішучага.

Так нараджаецца *эсэ* — мастацка-публіцыстычны жанр, у якім глыбокая задума арганічна спалучаецца са свабоднай, натуральнай манерай выкладання, і якому ўласцівы аўтарская адкрытасць і суб'ектыўнасць, экспрэсіўнасць і вобразнасць, папярэднасць і эмпірычнасць, лаканічнасць і вытанчанасць стылю.

Менавіта наш складаны час асабліва вылучыў жанр эсэ, зрабіў яго папулярным. У апошнія гады на фоне светапогляднага крызісу ў краіне адбываецца актывізацыя грамадскай свядомасці, развіццё самасвядомасці асобы, публіцыста перш за ўсё. Як справядліва заўважыў В. Г. Бялінскі, «калі ёсць ідэі часу, то ёсць і формы часу».

К. П. ЮРОЙЦЬ

## СУЧАСНЫ ЗМЕСТ ГАЗЕТНАЙ РУБРЫКІ «НА ТЭМЫ МАРАЛІ»

З усёй сукупнасці праблем грамадзянскага жыцця, якія асвятляюцца ў друку, маральная праблематыка найменш даследаваная. Зразумець прыроду сённяшніх перамен у жыцці нашага грамадства, прааналізаваць сацыяльны змест маральных паводзін людзей у новых умовах, убачыць іх у штодзённых буднях, у працоўных здзяйсненнях і побыце, дакладна намаляваць вобраз сапраўднага героя нашых дзён — адзін з актуальных напрамкаў беларускага друку.

Удалае адлюстраванне жыцця ў яго тыповых праявах — творчая ўдача журналіста. І наадварот, няўвага да прыярытэтных жыццёвых арыенціраў, павярхоўны погляд на справы і ўнутраны свет сучасніка спараджае дробнатэм'е, недакладнасць аўтарскай пазіцыі. Цесная сувязь паміж прафесійным майстэрствам і чуйнасцю да ідэй нашага часу надаюць журналісцкай працы сэнс і грамадскую значнасць.

Галоўны аб'ект даследавання журналіста-аналітыка, публіцыста— чалавек. Аналіз свету чалавечай асобы павінен адбывацца не на павярхоўным праўдападабенстве, не на бесстароннім рэгістраванні фактаў, а на раскрыцці сутнасці працэсаў руху жыцця, падзей і з'яў сённяшняга дня.

Ні дабрабыт, ні адукаванасць, ні выхаванне не ідуць у абавязковым парадку побач з высокай чалавечай духоўнасцю. Пакуль чалавек не сутыкнуўся з другім чалавекам, пакуль не прайшоў праз школу працоўнага выхавання, ні праз якую яго сталую мараль наогул нельга гаварыць. Толькі ў калектыве, ва ўзаемаадносінах з іншымі людзьмі чалавек выяўляе сябе.

Сёння ў падыходзе рэдакцый да асвятлення ролі калектываў у фарміраванні маралі, пры яўнай тэматычнай пераразнастайнасці, праглядваецца імкненне паказаць сітуацыі ў непарыўнай сувязі ўсіх сфер грамадскага жыцця — эканамічных, сацыяльна-палітычных, духоўных. Аб'ектам журналісцкага аналізу становяцца маральныя адносіны, якія раскрываюцца ў сацыяльнай практыцы праз паводзіны людзей, іх учынкі. Таму аб'ектам этычнага даследавання журналістыкі павінны быць рэальныя, вынікаючыя з наяўных умоў існавання людзей практычныя

маральныя адносіны, жывы вопыт маральнага ўзаемадзеяння і сувязі. Учынкі людзей, іх вартасныя якасці, як пазітыўныя, так і негатыўныя, а таксама індывідуальныя і калектыўныя дзеянні гэтых людзей журналісты ацэньваюць праз прызму дзеючых у грамадстве маральных прынцыпаў, звычаяў, традыцый. Прычым часта, калі ўчынак служыць падставай для аналізу маральнай матывацыі, журналіст дае ацэнку і сацыяльнай сітуацыі, якая зрабіла ўплыў на выбар чалавекам спосабу рэалізацыі яго асабістай актыўнасці.

Так, фактычнай асновай карэспандэнцыі У. Чарнова «Запозненае раскайванне», надрукаванай у газеце «Советская Белоруссия» (1991. 27 ліпеня), сталі дзеянні былога дырэктара магазіна № 15 «Вільнюс» г. Мінска А. Сталярскага, які распараджаўся дзяржаўнай маёмасцю і таварамі як уласнымі. І хоць журналіст падрабязна выпісаў гісторыю жыцця і грэхападзення менавіта А. Сталярскага, ён меў на ўвазе больш значную мэту: раскрыць сацыяльныя карані злачынства, створаныя самім грамадствам умовы для распаўсюджання гэтай заганы.

Пералік знойдзеных і канфіскаваных на дачы А. Сталярскага тавараў уражвае. І натуральна, заўважае аўтар, суд цікавіла стаўленне калектыву магазіна да дзеянняў былога дырэктара. Апыталі ўсіх работнікаў. І амаль што ўсе яны ў адзін голас абаранялі А. Сталярскага, называлі яго цудоўным кіраўніком, які заўсёды мог забяспечыць выкананне плана, быў строгі да падначаленых, але не забываў і пра іх патрэбы. Хіба чытачу не ясна, чаму ў ходзе суда работнікі магазіна так высока ацэньвалі дзелавыя якасці дырэктара-злодзея і спекулянта: таму што дэфіцытныя тавары, якія паступалі ў магазін, даставаліся і ім. І калі ў іх пыталіся, ці былі ў дырэктара парушэнні правілаў продажу, маўчалі, альбо адказвалі, што ім пра гэта невядома.

Аўтар не толькі раскрыў маральную сутнасць прадстаўніка «марадзёраў гандлю» А. Сталярскага. Ён стварыў партрэт спекулянта, свайго роду тып, які сфарміраваўся ва ўмовах першапачатковага накаплення капіталу, калі значная частка камерсантаў не прызнае ў бізнесе ніякіх маральных нормаў. Журналіст звяртаецца непасрэдна да жыццёвага вопыту чытача, нібы запрашаючы яго спраецыраваць прапанаваную сітуацыю на акаляючае асяроддзе і знайсці ў ёй аналагі. Гэты прыём дапамагае выкрыць адну з прычын жывучасці спекуляцыі і масавых крадзяжоў — пасіўнае ўспрыманне іх тымі, хто карыстаецца паслугамі легальных рабаўнікоў.

Але галоўная прычына з'явы, даказвае журналіст, не ў звычайнай псіхалогіі абываценя, а ў эканамічнай сітуацыі, якая разбурае як сацыяльныя адносіны ў грамадстве, так і яго маральную аснову. У гэтым сцвярджэнні змяшчаецца ядро палемікі, якая распачалася на старонках «Советской Белоруссии» пасля надрукавання карэспандэнцыі. Да таго ж узнік новы аспект тэмы: пакуль не перакрыем незаконныя каналы забеспячэння, будуць тлусцець спекулянт і злодзей (комплексная распрацоўка тэмы ў сацыяльна-эканамічным і маральна-прававым аспектах).

Прыведзены прыклад дастаткова характэрны з пункту гледжання дыялектычнага падыходу журналістаў да ацэнкі маральнай сутнасці чалавечай актыўнасці (пазітыўнай і негатыўнай), калі за паводзінамі асоб выразна праглядваецца другі план, дзе ў полі зроку журналіст трымае тыповую з'яву эканамічнага ці сацыяльнага жыцця грамадства, вывучае яго прыроду, узаемасувязь з іншымі з'явамі рэчаіснасці.

Ацэнка журналістам маральнага зместу чалавечай дзейнасці падключае чытача да абдумвання маштабных праяў аналагічнага плану і ўвогуле маральнага стану грамадства. І гэта, бадай, адно з галоўных прызначэнняў журналісцкай дзейнасці — актывізаваць чытацкае мысленне. Чалавек, які думае, прыходзіць да пэўных высноў, фарміруе ў сабе належныя перакананні.

Публіцыстычныя тэксты — гэта творы, у якіх аператыўна даследуюцца жыццёвыя сітуацыі, абагульняюцца актуальныя факты і з'явы, аргументуецца пункт гледжання аўтара з мэтай уздзеяння на грамадскую думку, грамадскую памяць і аказання пэўнай сацыяльна-практычнай дапамогі тым, да каго звернуты аўтарскі маналог. Пры гэтым журналіст прыбягае да своеасаблівага спалучэння логіка-абстрактнага і канкрэтна-

вобразнага мыслення, уздзеяння на розум і пачуцці чалавека, фарміруючы яго ідэйныя перакананні.

Эмацыянальная рэакцыя чытача на публіцыстычны твор, у якім адлюстраваны сацыяльна-значныя сітуацыі рэчаіснасці, з'яўляецца важнай часткай ацэначна-маральнага механізму і грунтоўна ўплывае на актыўнае стаўленне чалавека да грамадскай практыкі. Гэта ў першую чаргу і прымушае журналіста ацэньваць агульную дзейнасць індывідаў і прэпарыраваць маральную сітуацыю ў пэўнай сферы ці на канкрэтным участку чалавечай дзейнасці ў форме эмацыянальна-вобразнага маналогу.

Маральная ацэнка журналістам праяў чалавечай жыццядзейнасці ёсць сацыяльная ацэнка, таму што аб'ект маральнай ацэнкі — чалавек, у якім канцэнтруецца сутнасць усіх грамадскіх адносін і форм існавання. Прычым маральная ацэнка можа быць выказана не адкрыта, а дадзена ў падтэксце, праз дэталь-сімвал, адпаведны асацыятыўны кампанент і да т. п.

Друк Рэспублікі Беларусь, абапіраючыся на ўстойлівыя народныя традыцыі, не зважаючы на крызісныя з'явы, працягвае распрацоўваць эканамічную, сацыяльна-бытавую, палітычную, культурную і іншую праблематыку комплексна — з улікам іх адпаведнасці маральным крытэрыям грамадства, якія абумоўліваюць шматгранную дзейнасць людзей, іх фарміраванняў і аб'яднанняў у самых розных сітуацыях.